РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЛАСІ́ЦКІ** (Łasicki) Ян (1534? — пасля 1599), польскі гісторык, бібліёграф, рэлігійны дзеяч. У 1556—61 вучыўся ва універсітэтах Страсбурга, Жэневы, Лазаны, Цюрыха, Парыжа, Падуі і інш. Займаўся кнігазнаўствам, напісаў некалькі прац па вывучэнні рэлігіі (асабліва кальвінізму). З 1581 у Вільні. Апошнія гады жыцця правёў у Заслаўі каля Мінска. Цікавіўся этнаграфіяй на-

родаў, якія насялялі Рэч Паспалітую, тэорыяй культуры. Пісаў на лацінскай мове. У працы «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнне, вясельныя і пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татараў...» (1582) апісваў асаблівасці архітэктуры Полацка, Вільні і інш. гарадоў, нар. адзенне, стравы, аспекты матэрыяльнай культуры. Акцэнтуючы ўвагу на негатыўных момантах, падаў этнаграфічныя апісанні сямейных абрадаў беларусаў (мяркуецца, з наваколляў Заслаўя). У апісанні вяселля паказаў сватанне, выкраданне нявесты, вянчанне, выкананне танцаў, ваджэнне карагодаў. Расказваючы пра пахавальны абрад, спыніўся на абмыванні, апрананні нябожчыка, знаходжанні яго ў хаце, вынасе труны на могілкі і паводзінах людзей падчас пахавання і памінак. Упершыню выкарыстаў тэкст пахавальнага галашэння. Нягледзячы на тэндэнцыйнасць, этнаграфічныя апісанні Л. каштоўныя як матэрыял для гістарычнай этнаграфіі. Яго твор «Пра багоў самагітаў, іншых сарматаў і несапраўдных хрысціян» (1615) даў шырокае ўяўленне пра свет язычніцкіх вераванняў жыхароў тагачаснай Літвы.

*Тв.*: Бел. пер. — у кн.: Вяселле: Абрад. Мн., 1978. С. 37—38, 617; у кн.: Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986. С. 99—100.

*Літ.*: B a r y c z H. Jan Łasicki: Studium z dieów polskiej kultury naukowej XVI w. Wrocław etc., 1973.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ